*Дзе няма парадку і літары права,*
*няма шчасця, няма згоды.*

Юзаф Выбіцкі
*Патрыятычныя лісты*

# Уступ

## Гістарыяграфічны агляд

Анджэй Загорскі ў манаграфіі, у якой трактавалася аб усталяванні ды эвалюцыі сістэмы органаў дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай у часы яе падзелаў, заўважаў, што арганізацыя ды дзейнасць парадкавых камісій не дачакалася змястоўнага даследавання[1]. У значнай ступені гэта думка застаецца актуальнай. Праблематыка ўзнікнення і функцыянавання органаў мясцовай улады ў часы Чатырохгадовага сойма ў Вялікім Княстве Літоўскім амаль не вывучаная. У канцы XIX ст. гісторыя парадкавых камісій у часы Станіслава Аўгуста прыцягнула ўвагу Тадэвуша Корзана і Ігнацыя Бараноўскага[2]. Дзейнасць цывільна-вайсковых камісій на старонках сваёй манаграфіі, у якой апавядалася пра Вялікі сойм, асвятляў Валяр'ян Калінка[3]. У другой палове XX ст. вывучэннем дзейнасці мясцовага кіравання займаліся польскія гісторыкі[4].

---

[1] A. Zahorski, *Centralne instytucje policyjne w Polsce w dobie rozbiorów*, Warszawa, 1959, s. 65.

[2] I. Baranowski, *Komisje porządkowe (1765—1788)*, «Rozprawy Akademii Umiejętności Wydziału Historyczno-Filozoficznego», 1907, s. 2, t. XXIV, s. 107—150; T. Korzon, *Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe wojewódzkie i powiatowe w latach 1790—1792*, «Ateneum», 1882, R. VII, t. I, z. 1, s. 427—455; той жа, *Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764—1794)*, t. II, Kraków—Warszawa, 1897, s. 296—297, 301; t. V, s. 196—201.

[3] W. Kalinka, *Sejm Czteroletni*, t. I, cz. 2, wyd. 4, Kraków, 1895, s. 642—647.

[4] F. Koneczny, *Dzieje administracji w Polsce*, Wilno, 1924, s. 232—238; B. Leśnodorski, *Dzieło Sejmu Czteroletniego (1788—1792)*, Wrocław, 1951, s. 333—341; J. Bardach, B. Leśnodorski, M. Pietrzak, *Historia ustroju i prawa polskiego*, t. II, Warszawa, 1966, s. 538—539; J. Rutkowski, *Historia gospodarcza Polski*, Poznań, 1947, s. 313—315, 328; J. Ptaśnik, *Miasta i mieszczaństwo w dawnej Polsce*, Warszawa, 1949, s. 323—340; *Kronika*, «Czasopismo Prawno-Historyczne», 1975, t. 27, z. 2, s. 342—343 (абарона

Сур'ёзны ўклад у вывучэнне мінулага органаў мясцовай улады ў ВКЛ зрабіў Анджэй Загорскі[5] і Леанард Ратайчык, які даследаваў гісторыю ваеннай справы эпохі Станіслава Аўгуста[6]. Цікавыя звесткі пра дзейнасць камісій у галіне сістэмы адукацыі прыводзяцца ў даследаваннях Тадэвуша Мізі і Ірэны Шыбяк[7]. Роля мясцовай улады ў развіцці сістэмы аховы здароўя і шпітальнай справы закраналася Ядвігай Янкоўскай, Тадэвушам Срогашам і Анджэем Загорскім[8].

Вынікамі ўсё большай цікавасці да вывучэння згаданай праблематыкі ў 60-80-я гады XX ст. было з'яўленне шэрагу прац польскіх гісторыкаў, якія разглядалі мінулае малапольскіх, люблінскіх і вялікапольскіх парадкавых камісій[9]. У той жа

*(гл. папярэднюю старонку)*

доктарскай працы Веслава Шаі «Wielkopolskie komisje porządkowe cywilno-wojskowe 1791-1792»); W. Witkowski, *Historia administracji w Polsce 1764—1989*, Warszawa, 2007, s. 79—80; A. Lityński, *Samorząd szlachecki w Polsce w XVI—XVIII w.*, -Kwartalnik Historyczny», 1992, t. 99, № 4, s. 30—32.

[5] A. Zahorski, *Centralne instytucje policyjne w Polsce w dobie rozbiorów*, Warszawa, 1959.

[6] L. Ratajczyk, *System zaopatrzenia i uzbrojenia wojska Rzeczypospolitej w okresie reform Sejmu Czteroletniego 1788—1792*, «Materiały i Studia», 1973, № 22; той жа, *Wojsko i obronność Rzeczypospolitej 1788—1792*, Warszawa, 1975; той жа, *Przezwyciężenie kryzysu militarnego Polski przed reformami Sejmu Czteroletniego*, Warszawa, 1975.

[7] T. Mizia, *Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe a szkolnictwo parafialne w okresie Sejmu Czteroletniego*, «Rozprawy z Dziejów Oświaty», 1963, t. VI, s. 40—87; I. Szybiak, *Szkoły parafialne w Wielkim Księstwie Litewskim w czasach Komisji Edukacji Narodowej*, «Rozprawy z Dziejów Oświaty», 1968, t. XI, s. 99—123.

[8] J. Jankowska, *Źródła do dziejów medycyny w Polsce w aktach Komisji Policji Obojga Narodów i Komisji Policji Koronnej (1791—1794)*, «Źródła i Dokumenty do Historii Medycyny», 1955, № 3; T. Srogosz, *Problemy sanitarno-zdrowotne w działalności administracji Rzeczypospolitej w okresie stanisławowskim,* Łódź 1993; той жа, *Zakres działalności władz państwowych w szpitalnictwie Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1768—1794*, «Prace Naukowe Wyższej Szkoły Pedagogicznej w Częstochowie» 1997. Zeszyty Historyczne, z. 4, s. 243—260; A. Zahorski, *Centralne instytucje policyjne w Polsce w dobie rozbiorów*, Warszawa, 1959.

[9] W. Ćwik, J. Reder, *Lubelszczyzna. Dzieje rozwoju terytorialnego, podziałów administracyjnych i ustroju władz,* Lublin, 1977, s. 52, 55; J. Mazurkiewicz, *Lublin w okresie reform (1764—1795) // Dzieje Lublina*, Lublin, 1965, s. 170—172; Z. Wielebska, *Krakowska Komisja Porządkowa Cywilno-Wojskowa (1789—1794),* «Rocznik Historyczno-Dydaktyczny WSP w Krakowie», 1987, R. XII, s. 187—197. Да гэтай групы таксама належаць неапублікаваныя працы Барбары Сабалёвай, Веслава Шаі (Wiesław Szaja, *Wielkopolskie Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe (1791—1792)* (машынапіс доктарскай працы знаходзіцца ў бібліятэцы Універсітэта імя Адама Міцкевіча ў Познані), Славаміра Барасінскага: Sławomir Barasiński, *Wielkopolskie Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe jako organy władzy policyjnej*, рукапіс захоўваецца ў бібліятэцы Універсітэта імя Адама Міцкевіча ў Познані (http://nauka.opi.org.pl/raporty/opisy/synaba/75000/ sn75832.htm); J. Bardach, B. Leśnodorski, M. Pietrzak, *Historia…*, t. II, s. 538).

час гісторыя парадкавых камісій у Вялікім Княстве Літоўскім з'явілася прадметам спецыяльнага даследавання толькі ў апошняе дзесяцігоддзе[10].

Зыходзячы з факта недастаковай распрацаванасці праблематыкі, асноўнай мэтай дадзенай манаграфіі з'яўляецца прадстаўленне працэсу ўсталявання, фармавання і дзейнасці органаў мясцовай улады ў Вялікім Княстве Літоўскім у яго межах пасля першага падзелу. У першую чаргу ўвага ў ёй будзе нададзеная разгляду перадумоў узнікнення органаў мясцовага кіравання, а таксама высвятленню пытання іх кампетэнцыі, парадку фармавання і структуры.

Улічваючы шырокае кола правоў і абавязкаў мясцовых улад, у працы плануецца даследаваць тыя аспекты дзейнасці, на якія камісары скіроўвалі свае асноўныя намаганні. Да ліку задач камісараў адносілася правядзенне перапісаў насельніцтва ці парафіяльных метрык, матэрыялы якіх даюць магчымасць высветліць розныя гісторыка-дэмаграфічныя параметры (напрыклад, колькасць насельніцтва паасобных паветаў) ці правесці аналіз саслоўнай, этнаканфесійнай структуры грамадства ці падтрымкі ды заахвочвання перасяленцаў.

У кампетэнцыйнае поле камісіі ўваходзіла дзейнасць у галіне бяспекі і грамадскага парадку ў павеце, аховы дзяржаўнай мяжы, а таксама судовага разбору спрэчак і канфліктаў паміж цывільным насельніцтвам і войскам. Неабходным падаецца аналіз палітыкі парадкавых камісій, накіраванай на добраўпарадкаванне гарадской прасторы, увядзенне супрацьпажарных мерапрыемстваў, паляпшэнне санітарна-гігіенічнага

[10] J. Gordziejew, *Próby reform miejskich у Гродне w dobie oświecenia*, «Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie», R. 46: 2001, s. 227—257; той жа, *Z dziejów Komisji Porządkowych Cywilno-Wojskowych w Wielkim Księstwie Litewskim*, «Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie», R. 47: 2002, s. 167—192; той жа, *Civilinės karinės tvarkos komisijos ir Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės miestai ketvierių metų seimo laikotarpiu // Viešosios ir privačiosios erdės XVIII amžiaus Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje*, Vilnius, 2008, s. 253—263; той жа, *Źródła do dziejów Komisji Cywilno-Wojskowych w Wielkim Księstwie Litewskim z lat 1789—1792 // Rzeczpospolita państwem wielu narodowości i wyznań XVI—XVIII wiek*, red. T. Ciesielski, A. Filipczak-Kocur, Warszawa—Opole, 2008, s. 143—146; той жа, *Z dziejów polityki budżetowej w Wielkim Księstwie Litewskim w okresie Sejmu Czteroletniego // Wielkie Księstwo Litewskie: polityka, gospodarka, kultura, prawo, wyznania*, Warszawa (праца падрыхтаваная да друку); R. Šmigelskytė-Stukienė, *Tarp tradicijų ir novacijų*: *Upytės pavieto bajorija XVIII a. pabaigoje // Iš Panevėžio praities*: *Upytės žemei 750 metų*, Panevėžys, 2004, s. 99-102, http://www.paneveziomuziejus.lt/get.php?f.175.

становішча, дасклананелнне сістэмы аховы здароўя ці ўзроўню адукацыі. На парадкавыя камісіі было ўскладзенае правядзенне мерапрыемстваў гаспадарчага характару. Сярод іх вылучалася забеспячэнне бюджэту фінансавымі сродкамі, вялізная частка якіх ішла на пакрыццё выдаткаў на войска, яго ўтрыманне.

Храналагічныя рамкі працы абмяжоўваюцца 1789 г., калі былі створаныя цывільна-вайсковыя камісіі, і вайной з Расіяй у 1792 г.

## Крыніцы

Амаль што сто год таму польскі гісторык Станіслаў Кутшэба выказаў меркаванне аб незадавальняючым стане захавання актавых кніг цывільна-вайсковых камісій, лаканічна сцвярджаючы: «Захваліся нешматлікія кнігі павятовых цывільна-вайсковых камісій 1792 года»[11]. Цалкам верагодна, што апрыёрнае выказванне аўтара было вынікам празаічнай адсутнасці магчымасці азнаямлення з адпаведнымі архіўнымі зборамі.

Неабходна адзначыць, што ў выніку архіўных пошукаў удалося выявіць разнастайныя крыніцы. У першую чаргу гэта матэрыялы бягучага справаводства мясцовых улад, г.зн. актавыя кнігі і ўніверсалы парадкавых камісій, іх карэспандэнцыя са Скарбовай і Вайсковай камісіямі, акты Камісіі паліцыі і Варты правоў. Звесткі пра парадкавыя камісіі змяшчаюць кнігі земскіх і гродскіх судоў, а таксама магістратаў.

У другой палове XIX ст. у зборах Віленскага архіва старажытных актаў былі выяўленыя шматлікія прабелы. Напрыклад, у 1879-1882 гг. было страчана 145 адзінак захавання[12]. Гэта тычыцца матэрыялаў цывільна-вайсковых камісій. Паводле звестак Мікалая Гарбачэўскага, у 1872 г. у фондах згаданага архіва захоўваліся кнігі наступных камісій: браслаўскай, лідскай, вількамірскай, гарадзенскай, менскай, мазырскай, навагрaд-

[11] S. Kutrzeba, *Historia źródeł dawnego prawa polskiego*, t. I, Lwów—Warszawa—Kraków, 1925, s. 129; t. II, 1926, s. 61.

[12] R. Mienicki, *Archiwum Akt Dawnych w Wilnie w okresie od 1795 do 1922 r.*, Warszawa, 1923, s. 123; *Inwentarz byłego Wileńskiego Archiwum Centralnego*, cz. 1, Wilno, 1929, s. 417, 436.

скай, аршанскай, пінскай, рэчыцкай і случарэцкай[13]. На страты архійных фондаў, выкліканых іх эвакуацыяй у 1915 г., у тым ліку на «стан цывільна-вайсковых архіваў камісій ВКЛ», звяртаў увагу Рышард Мяніцкі[14].

У дадзены момант у зборах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Менску знаходзяцца акты ці адзінкавыя дакументы гарадзенскай, ваўкавыскай, слонімскай, навагрудскай, случарэцкай, менскай, мазырскай, рэчыцкай, аршанскай, браслаўскай, віцебскай, полацкай і пінскай камісій[15]. Акрамя згаданых крыніц у дадзенай працы былі выкарыстаныя адзінкавыя кнігі ці дакументы віленскай, лідскай, вількамірскай, расейнскай, браслаўскай і ковенскай камісій, якія былі адшуканыя ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве і бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ім. Урублеўскіх[16].

Асаблівай увагі заслугоўвае кніга цывільна-вайсковай камісіі Аршанскага павета, тытульны ліст якой не захаваўся. Яна змяшчае шматлікія скаргі насельніцтва, якое пражывала на мяжы ВКЛ з Расійскай імперыяй, усталяванай пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. У кнізе натаваліся звесткі аб наездах, разбоях і грабяжах расійскіх жаўнераў у беларускіх вёсках, кантролі руху насельніцтва, затрыманні збеглых сялян, іх бунтах, праблемах забеспячэння арміі[17].

Крыніцай вывучэння гісторыі органаў мясцовай улады служаць матэрыялы Чатырохгадовага сойма, карэспандэнцыя парадкавых камісій з Камісіяй паліцыі і Вартай правоў, якія

---

[13] Н. Горбачевский, *Каталог древним актовым книгам губерний: Виленской, Гродненской, Минской и Ковенской, а также книгам некоторых судов губерний Могилёвской и Смоленской, хранящихся в Центральном Архиве в Вильне*, Вильно, 1872, с. 193, 248, 427, 437, 454, 467, 485, 517, 556, 574.

[14] R. Mienicki, *Archiwa Wielkiego Księstwa Litewskiego // Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17—20 września 1935 r.*, t. I, Lwów, 1935, s. 408, 413.

[15] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ), Ф. 1505 воп. 1 спр. 1-7; Ф. 1794 воп. 1 спр. 1; Ф. 1886 воп. 1 спр. 1; Ф. 1887 воп. 1 спр. 1—6; Ф. 1889 воп. 1 спр. 1—17; Ф. 1891 воп. 1 спр. 1—7; Ф. 1891 воп. 1 спр. 1—3, Ф. 1892 воп. 1 спр. 1; Ф. 1893 воп. 1 спр. 1; Ф. 1894 воп. 1 спр. 1—6; Ф. 1895 воп. 1 спр. 1—3; Ф. 1938 воп. 1 спр. 1—2; Ф. 1942 воп. 1 спр. 1.

[16] Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей ЛДГА), старажытныя акты (далей СА), 4540, 6491, 6492, 14574, 15383, 15384, 18505, 18533, 18535, 18572, 18626, 18627; Ф. 1135 воп. 23 спр. 53; Ф. 1282 воп. 1 спр. 4616; аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы ім. Урублеўскіх (далей АР БАН Літвы), F 273—1348.

[17] АР БАН Літвы, F 17—282.

змяшчаюць дадзеныя пра розныя аспекты штодзённага жыцця мясцовых супольнасцей[18].

Аналіз гісторыі цывільна-вайсковых камісій прадстаўляецца магчымым дзякуючы вывучэнню перапіскі Скарбовай камісіі ВКЛ з цывільна-вайсковымі камісіямі. Да гэтых крыніц адносяцца рапарты парадкавых камісій, люстрацыі дымоў і тарыфы падымнага падатку[19]. Аб дзейнасці камісій можна даведацца з карэспандэнцыі камісій з Вайсковай камісіяй і захаваных у гэтых актах выпісак з кніг асобных парадкавых камісій[20]. Наступнай групай крыніц па аналізаванай праблематыцы з'яўляюцца матэрыялы Трыбунала ВКЛ, у якіх удалося натрапіць на звесткі аб развіцці тагачаснай шпітальнай справы[21].

Напэўна, нельга абысці ўвагай матэрыялы земскіх судоў[22]. Напрыклад, у актавых кнігах земскага суда Гарадзенскага павета ўдалося выявіць фрагменты кніг мясцовай парадкавай камісіі, у тым ліку кніг пашпартоў[23]. У земскіх кнігах Ковенскага павета 1791-1792 гг. захавалася прызначэнне ў камісіі, або «крэдэнс на цывільна-вайсковае камісарства»[24]. А ў фонд земскага суда Эйшышскага павета былі ўключаныя кнігі Лідскай парадкавай камісіі. Звесткі пра мясцовую адміністрацыю даюць цяльшайскія земскія кнігі Жамойцкага княства[25].

Звесткі па гісторыі цывільна-вайсковых камісій сустракаюцца на старонках гродскіх кніг. Як правіла, парадкавыя камісары выступалі ў гэтых дакументах у якасці аднаго з бакоў здзелкі куплі-продажу зямельных уладанняў або нерухомай уласнасці ў гарадах[26]. Пэўную цікавасць мае інфармацыія, якая

---

[18] Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (далей ГАСА), Архіў Польскага Каралеўства (далей АПК) 149—152, 205, 233; Т.зв. Літоўская Метрыка (далей Т.зв. ЛМ) IX 27, 44; VII 164, 165, 169, 171—174; Архіў Патоцкіх (далей АП) 104; Акты Чатырохгадовага сойма (далей АЧС) 14.

[19] ЛДГА, Ф. 11 воп. 1 спр. 123, 124, 155, 1005 (СА 3709); 1006 (СА 3713), СА 4056, 4151, 4153, 4154, 4156; Ф. 11 воп. 2 спр. 227.

[20] ЛДГА, Ф. 4 воп. 2.

[21] ЛДГА, СА 894—896.

[22] ЛДГА, СА 15163 арк. 161—161адв., 571—572адв.

[23] НГАБ, Ф. 1755 воп. 1 спр. 196 арк. 42—347.

[24] ЛДГА, СА 13807 арк. 26.

[25] ЛДГА, СА 15163 арк. 161—161адв, 193, 340, 571—572адв.

[26] ЛДГА, Ф. 21 воп. 1 спр. 149 (СА 4806) арк. 3, 884—884адв, НГАБ, Ф. 1711 воп. 1 спр. 71, Ф. 1732 воп. 1 спр. 13, Ф. 1736 воп. 1 спр. 40.

паходзіць з матэрыялаў магістратаў[27], ці перапіска парадкавых камісараў з духавенствам і духоўнымі ўстановамі, напрыклад, з віленскім капітулам.

Кола крыніц пашыраюць заканадаўчыя дакументы, напрыклад, соймавыя канстытуцыі ці соймавыя праекты[28], акты, якія рэгламентавалі дзейнасць парадкавых камісій і іх узаемадачыненні з ўрадавымі ўстановамі, універсалы мясцовых улад, якія мелі абавязковую сілу на тэрыторыі асобных паветаў і рэгулявалі шматлікія аспекты штодзённага жыцця павятовых супольнасцей. У выніку архіўных пошукаў, праведзеных у зборах Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея і Аддзела старадрукаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта, удалося натрапіць на значную колькасць такіх адозваў[29]. Увагі

[27] ЛДГА, СА 15378; Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта (далей АР БВУ), F 5 B 66—3402.

[28] *Volumina legum* (далей *VL*), t. IX, Kraków, 1889, s. 221—222.

[29] *Komisja Policji Obojga Narodów. Obwieszczenie względem emigracji* z 3 kwietnia 1792 r. Аддзел старадрукаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта (далей АС БВУ), № 16848); *Komisja Policji ON (obwieszczenie)* z 1 marca 1792 r. (АС БВУ, № 16848 (2); *Uniwersał do duchowieństwa i obywatelów powiatu grodzieńskiego względem dawania raportów o ludności, zafundowania parafialnych szkół, zachęcania do osadzania ludności zagranicznej, utrzymywania miar i wag, ścigania dezerterów i hultajów i wnaszania podatków* z 31 grudnia 1789 r. (АС БВУ, № 16849); *Uniwersał uwiadamiający o myśli prawa względem dawania podwód żołnierzom* z 14 stycznia 1790 r. (АС БВУ, № 24722); *Uniwersał obligujący obywatelów o czynienie wczesnego zapasu na dostarczenie furażów* z 23 lutego 1790 r. (АС БВУ, № 24723); *Uniwersał determinujący cenę na wiktuały i furaże dostarczyć się mające żołnierzowi w marszu będących* z 2 marca 1790 r. (АС БВУ, № 24724); *Kommissya Porządkowa i Cywilno-Woyskowa powiatu grodzieńskiego. Uniwersał ponawiający cenę na furaże* z 21 kwietnia 1790 r. (АС БВУ, № 24727); *Uniwersał ustanawiający cenę na produkta w mieście JKMci Grodnie* z 4 maja 1790 r. (АС БВУ, № 24728); *Uniwersał uwiadamiający obywatelów o lustracji dymów prawem sejmu teraźniejszego determinowanej o poleceniach JWW Komisarzom lustrującym też dymy* z 31 maja 1790 r. (АС БВУ, № 24730); *Uniwersał ogłaszający list obwieszczalny marszałków sejmowych* z 14 sierpnia 1790 r. (АС БВУ, № 24732); *Uniwersał donoszący o ustanowionej cenie na moście i promie na rzece Niemnie będących oraz o utrzymanie onych i reparowanie dróg* z 20 sierpnia 1791 r. (АС БВУ, № 24733); *Uniwersał uwiadamiający obywatelów pttu grodzieńskiego względem importacji w racie teraźniejszej marcowej podatku dodatkowego z woli prawa oraz laudum prześwietnego pttu grodzieńskiego* z 1792 r. (АС БВУ, № 24735); *Komisja Porządkowa i Cywilno-Wojskowa powiatu grodzieńskiego* z 5 kwietnia 1792 r. (АС БВУ, № 24739); *Uniwersał determinujący dostarczanie rekrutów z kantonów i opłacenie pieniędzy* z 24 kwietnia 1792 r. (АС БВУ, № 24741); *Uniwersał od N.N. Rzpltej Stanów, obwieszczenie o prawach* […] *zamiarze pospol[itej] obrony uchwalonych* z 26 maja 1792 r. (АС БВУ, № 24744); *Komisja Cywilno-Wojskowa Policyjna w[ojewódz]twa wileń*[*skiego*] *z magistratem głównym i całą municypalnością wydziału wileńskiego* z 1 czerwca 1792 r. (ГДГАМ, КП-15116); *Komisja Policji Obojga Narodów. Obwieszczenie względem emigracji* z 3 kwietnia 1792 r. (АС БВУ,

заслугоўваюць захаваныя ўніверсалы цывільна-вайсковай камісіі Менскага ваяводства[30] і Пінскага павета 1790 г.[31], якія

(гл. папярэднюю старонку)

№ 16848); *Komisja Policji ON (obwieszczenie) z 1 marca 1792 r.* (АС БВУ, № 16848 (2); *Uniwersał do duchowieństwa i obywatelów powiatu grodzieńskiego względem dawania raportów o ludności, zafundowania parafi alnych szkół, zachęcania do osadzania ludności zagranicznej, utrzymywania miar i wag, ścigania dezerterów i hultajów i wnaszania podatków* z 31 grudnia 1789 r. (АС БВУ, № 16849); *Uniwersał uwiadamiający o myśli prawa względem dawania podwód żołnierzom* z 14 stycznia 1790 r. (АС БВУ, № 24722); *Uniwersał obligujący obywatelów o czynienie wczesnego zapasu na dostarczenie furażów* z 23 lutego 1790 r. (АС БВУ, № 24723); *Uniwersał determinujący cenę na wiktuały i furaże dostarczyć się mające żołnierzowi w marszu będących* z 2 marca 1790 r. (АС БВУ, № 24724); *Kommissya Porządkowa i Cywilno-Woyskowa powiatu grodzieńskiego. Uniwersał ponawiający cenę na furaże* z 21 kwietnia 1790 r. (АС БВУ, № 24727); *Uniwersał ustanawiający cenę na produkta w mieście JKMci Grodnie* z 4 maja 1790 r. (АС БВУ, № 24728); *Uniwersał uwiadamiający obywatelów o lustracji dymów prawem sejmu teraźniejszego determinowanej o poleceniach JWW Komisarzom lustrującym też dymy* z 31 maja 1790 r. (АС БВУ, № 24730); *Uniwersał ogłaszający list obwieszczalny marszałków sejmowych* z 14 sierpnia 1790 r. (АС БВУ, № 24732); *Uniwersał donoszący o ustanowionej cenie na moście i promie na rzece Niemnie będących oraz o utrzymanie onych i reparowanie dróg* z 20 sierpnia 1791 r. (АС БВУ, № 24733); *Uniwersał uwiadamiający obywatelów pttu grodzieńskiego względem importacji w racie teraźniejszej marcowej podatku dodatkowego z woli prawa oraz laudum prześwietnego pttu grodzieńskiego* z 1792 r. (АС БВУ, № 24735); *Komisja Porządkowa i Cywilno-Wojskowa powiatu grodzieńskiego* z 5 kwietnia 1792 r. (АС БВУ, № 24739); *Uniwersał determinujący dostarczanie rekrutów z kantonów i opłacenie pieniędzy* z 24 kwietnia 1792 r. (АС БВУ, № 24741); *Uniwersał od N.N. Rzpltej Stanów, obwieszczenie o prawach* […] *zamiarze pospol[itej] obrony uchwalonych z 26 maja 1792 r.* (АС БВУ, № 24744); *Komisja Cywilno-Wojskowa Policyjna w*[ojewódz]twa *wileń*[*skiego*] *z magistratem głównym i całą municypalnością wydziału wileńskiego* z 1 czerwca 1792 r. (Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей (далей ГДГАМ), КП-5116).

[30] *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa w. mińskiego* z 8 marca 1790 r. (Нацыянальная бібліятэка Польшчы (далей НБП), XVIII.4.123); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa mińskiego* z 27 marca 1790 r. (НБП, XVIII.4.119); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa mińskiego* z 6 kwietnia 1790 r. (НБП, XVIII.4.127 adl.; НБП, XVIII.3.3437); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa mińskiego* z 12 kwietnia 1790 r. (НБП, XVIII.4.118); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa w. mińskiego* z 12 maja 1790 r. (НБП, XVIII. 4.120); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa mińskiego* z 14 lipca 1790 r. *Uniwersał względem zbiegów, przychodniów, ludzi zagranicznych i form urlopów, paszportów, zaświadczeń, biletów tudzież względem reparacyi dróg* (НБП, XVIII.4.133); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa w. mińskiego* z 29 lipca 1790 r. (НБП, XVIII.4.137); *Komissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa w. mińskiego* z 27 listopada 1790 r.; *Uniwersał K.C.W. i P.W. w. mińskiego względem zsypki zbożowej* (НБП, XVIII.4.143 adl.); *Urządzenie Komissyi Cywilno-Wojskowej i Porządkowej województwa mińskiego dla porządku miasta JKMci mińska magistratowi tegoż miasta na sessyi dnia 30 miesiąca kwietnia 1790 r. wydane* (НБП, XVIII.4.121); *Katalog osób podających się za kandydatów do zasiadania w Kommissyi Cywilno-Wojskowej w województwie mińskim jeżeli to prześwietnemu województwu zdawać się będzie* (НБП, XVIII.4.136).

[31] *Komissya Cywilno-Wojskowa p[owia]tu piń*[*skiego*] z 8 marca 1790 r. (НБП, XVIII.4.128a).

знаходзяцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве. Да гэтай жа групы крыніц належыць кніга запісаў універсалаў Цывільна-вайсковай камісіі Ашмянскага павета Пастаўскай рэпартыцыі[32]. У фондзе т.зв. Літоўскай метрыкі са збораў Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве былі адшуканыя распараджэнні Троцкай і Мерацкай парадкавых камісій, а таксама іншых камісій з тэрыторыі ВКЛ[33].

---

[32] *Xsięga do zapisywania uniwersałów publicznych w kościele daugieliskim z Kommissyi Cywilno-Wojskowej powiatu oszmiańskiego repartycji postawskiej przezydującą sporządzona 1790* r. (АР БАН Літвы, F 8—46 (F 136—80) арк. 1—58).

[33] *Kommissya województwa trockiego* z 21 grudnia 1789 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał nakazujący opłatę podatku subsidii charitativi przez wszystkich duchownych do kancelarii w. trockiego* z 22 marca 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał zalecający obywatelom złożenia przywilejów i kontraktów, na których tak grobelne, mostowe, jako i jazowe na rzekach spławnych wybierali* z 23 marca 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał przypominający XX plebanom uskutecznia obowiązku względem komportowania funduszów* z 27 marca 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem ustanowienie ofcijantów na parafie i ich powinności oraz względem uregulowania powszechnego świadectw, paszportów i urlopów żołnierskich* z 17 kwietnia 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał zakazujący obywatelom tym, którzy przywilejów nie złożyli mostowego, groblowego, jazowego tak od kupców jako podróżnych wybieranie oraz ostrzegający, aby dziedzice od poddanych całoroczne z nowej ustawy podymne prócz jednej raty nie wybierali, tudzież zalecający, aby od ognia lasy psujące strzegli* z 27 kwietnia 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał oznaczający dyspartyment, według którego po wiele głów i których dóbr, jaki i na który termin przystawiony bydź ma rekrut* z 1 maja 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego* z 8 października 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porząd-kowa województwa trockiego* z 13 października 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał umieszczający wiadomość o czynnościach sejmu* z 13 grudnia 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem do JJ. PP. plebanów względem uczynienia raportu o ludności, o przybyciu i ubyciu, o młodzieży uczącej się i o ubogich znajdujących się w parafii* z 24 grudnia 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał ogłaszający niektóre względem zsypki zbożowej ustawy* z 27 grudnia 1790 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem podatków, raportów ludności, zsypki, paszportów, miar i wag, tabell po karczmach, przywilejów na mostowe etc. sług i kolendów żydowskich, ochrony budowli i delacji na przestępnych* z 7 lutego 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał o pozwach, aktoratach i paszportach* z 4 czerwca 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem Deputacji do ułożenia Codicem Praw Cywilnych i kryminalnych* z 21 czerwca 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał pardon dla dezerterów i oraz kurs monet ogłaszający* z 3 października 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał wedle instruktażów Komisji Skarbowej*

Аналіз такога багатага матэрыялу патрабуе пэўнай агаворкі. Нельга не звярнуць увагі на спецыфіку заканадаўчых актаў і нарматворчай дзейнасці органаў выканаўчай улады. На падставе дакументаў нельга рабіць адназначныя высновы аб іх выкананні і практычным увасабленні.

Звесткі пра цывільна-вайсковыя камісіі траплялі на старонкі варшаўскага і віленскага друку XVIII ст. Напрыклад, «Gazeta Warszawska» дэталёва інфармавала аб ходзе соймавых паседжанняў ці публікавала соймавыя канстытуцыі, паведамляла пра ўдзел камісараў ва ўрачыстых мерапрыемствах[34]. На старонках «Gazet Wileńskich» і «Addytamentu do Gazet Wileńskich» змяшчаліся звесткі аб увядзенні кніг зямянскіх судоў, паседжаннях дэпутацкіх і гаспадарчых соймікаў, удзеле мясцовых супольнасцей у абароне краіны ў 1792 г. ці развіцці шпітальнай справы[35]. Падобныя матэрыялы друкаваліся на старонак такіх газет, як «Gazeta Narodowa i Obca»[36], «Dziennik Rządowo-Ekonomiczno-Handlowy»[37] ды «Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczy»[38].

*(гл. папярэднюю старонку)*

*opłatę od przepraw determinujący* z 22 października 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem skór surowych i wyprawanych. Licytacja miasteczek, bezpieczeństwo, raporta ludności* z 14 grudnia 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał kurs monet ogłaszający* z 14 grudnia 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem Xięgi ziemiańskiej* z 4 styczna 1792 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa i powiatu trockiego. Uniwersał do obywatelów trockiego i mereckiego powiatowi* z 13 marca 1792 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego, powiatów trockiego i mereckiego* z [7] maja 1792 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał względem wagi fleszowej i nieprzyjmowania ludzi bez paszportów, b.d., Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa województwa trockiego. Uniwersał kurs monet ogłaszający* z 14 grudnia 1791 r.; *Kommissya Cywilno-Wojskowa i Porządkowa powiatu oszmiańskiego repartycji oszmiańskiej. Uniwersał względem uregulowania miar i wag, stanowienia oficjantów* z 8 marca 1790 r. (ГАСА, Т.зв. ЛМ, IX 27, арк. 245, 247—248, 250—253, 323, 324, 326, 340, 358—369, 372, 374, 416, 435).

[34] «Gazeta Warszawska» 1792, № 55, «Suplement do Gazet Warszawskich», 1790, № 17, 19.

[35] «Gazety Wileńskie», 28 stycznia 1792, № 4, 10 marca 1792, № 10; Addytament do «Gazet Wileńskich», 19 maja 1792.

[36] «Gazeta Narodowa i Obca» 1791, № 52, s. 210.

[37] «Dziennik Rządowo-Ekonomiczny Handlowy», 1790, R. V, cz. 1, s. 92 (дарагавізна ў Менску); cz. 3, s. 233 (перанясенне сталіцы Рэчыцкага павета), s. 241 (пытанне падымнага); cz. 4, s. 416—435 (спісы членаў парадкавых камісій), s. 450—462; R. VI, 1791, cz. 12, s. 459—461 (пытанне рапартаў камісіі).

[38] *Uwagi nad komisjami w Litwie*, «Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny», 1791, R. X, cz. IV, s. 321—331; «Pamiętnik Historyczno-Polityczno-Ekonomiczny», 1791, R. X, cz. X, s. 865.

У значна меншай ступені дзейнасцю мясцовых улад цікавіліся тагачасныя мемуарысты[39].

Аўтар выказвае ўдзячнасць Фонду польскай навукі (Fundusz na Rzecz Nauki Polskiej), Фонду Ланцкаронскіх (Fundacji Lanckorońskich) за дапамогу, аказаную ў 2005 г. у архіўных пошуках. За каштоўныя заўвагі хацелася б падзякаваць праф. Ежы Мальцу і праф. Анджэю Закшэўскаму, доктару навук Эве Даноўскай. За ўсебаковую дапамогу ў час назапашвання матэрыялаў я хацеў бы падзякаваць доктару навук Стэфану Гансяроўскаму і доктару гісторыі Марыушу Савіцкаму, а таксама Ганне Паўлоўскай і Алесі Саўчук. За добразычлівасць і каштоўныя парады вялікая падзяка архівістам Руце Шрубене, Леакадзіі Аляхновіч і Крысціне Сасноўскай з Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні, Марыі Івановіч з Нацыянальнай бібліятэкі Літвы, а таксама Івоне Пятшкевіч, Андрэю Мацуку, Герману Брэгеру і Зміцеру Яцкевічу. Словы ўдзячнасці належаць кандыдату гістарычных навук Аляксею Шаландзе і кандыдату гістарычных навук Сяргею Амельку за дапамогу ў пошуках крыніц і расчытанні сфрагістычных матэрыялаў. За каштоўныя мовазнаўчыя кансультацыі хацелася б падзякаваць кандыдату філалагічных навук Таццяне Рамзе і кандыдату філалагічных навук Дзмітрыю Клябанаву.

[39] M. Starzeński, *Na schyłku dni Rzeczypospolitej* (1757—1795), wyd. H. Mościcki, Warszawa, 1914; A. Chrząszczewski, *Pamiętnik oficjalisty Potockich z Tulczyna*, wyd. J. Piechowski, Wrocław, 1976.